Vrublewskio Bibliotekos

ŠALTINIS

Krynica

Biełaruskaja Narodnaja Hazeta

Vychodzić u aŭtorki i piatnicy.

№ 12 (721).
Cana 10 ct.
VILNIA, 13.II.1940 h.
Hod vydańnia XXII.

Padpiska na hod — 5 litaŭ, na paŭhoda — 3 lity.
Zahranicu — ŭdvaja daražej.
Abviestki: za 1 mm u tekście 40 ct., za tekstam 30 ct.

Adresas red.-adm.: Vilnius, Zavalinė g-vė 1—2, tel. 28-32
Adres red. i admin.: Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.
Redakcyja i administracyja adčyniena 10—14 hadz.
Redaktar pryjmaje 9—10 hadz.

ZA NIAISNUJUČYJA PRASTUPKI

(Da spravy red. J. Paźniaka)

Usie dobra pamiatajem tyja kastryčnikavyja dni minułaha hodu, kali savieckija ŭłady ŭ Vilni, miž inšymi, aryštavali redaktara „Krynicy" Jana Paźniaka i vyviežli ŭ Savieckuju Biełaruś. Mnoha było tady ab hetym hutarak i ździŭleńnia. Usia cikavaść hetaj spravy była i jošć u tym, što jaho aryštavali tyja, jakija pryjšli asvabadžać biełarusaŭ ad palakoŭ i što aryštavali jakraz taho, chto tak mnoha ad tych-ža palakoŭ paciarpieŭ. Nie zabyvajma, što redaktar J. Paźniak za „Krynicu" mieŭ niešta bolš 30 sudovych spraŭ.

Ad času aryštavańnia red. J. Paźniaka ŭžo prajšło try z pałavinaj miesiacy. Užo sioj-toj i pryzabyŭ jaho i jahonuju sapraŭdy niazvyčajnuju spravu i dolu. Da niadaŭna my tut u Vilni navat dakładna nia viedali, dzie Paźniak znachodzicca i što tam z im dziejecca. Tymčasam niadaŭna daviedvajemsia, što znachodzicca jon u Vialejcy ŭ vastrozie, dzie miž inšymi znachodziacca i niekatoryja inšyja vyviezienyja z Vilni biełarusy, i što vinavaciać jaho savieckija ŭłady ni bolš i ni mienš, jak u... polskim špijanažy! Daviedvajemsia tak-ža, što hetkija niesamavityja zakidy staviać jamu na padstavie... „Krynicy", imienna na padstavie tych artykułaŭ i zaciemak, jakija byli škiravanyja praciŭ kamunizmu i jakija nia raz byli krytykaj savieckaj palityki adnosna Biełarusi.

Voś-ža, nakolki možna zrazumieć varožaść savieckich uładaŭ da red. Paźniaka za jaho nacyjanalnuju biełaruskuju palityku i za jaho antykomunistyčnyja artykuły, nastolki susim niezrazumiełym źjaŭlajecca heny sapraŭdy kryŭdny dla Paźniaka zakid ...polskaha špijanažu.

Mahčyma, što pradstaŭniki savieckaj ułady hetki zakid Paźniaku staviać nie razumiejučy tych abstavinaŭ, u jakich biełaruski redaktar pad Polščaj pracavaŭ, i dzieła hetaha nie razumiejuć henych jahonych antykamunistyčnych vystupleńniaŭ. Viedama, nie adno, što mahło być dla kamunizmu niapryjemnym u hazecie niekamunistyčnaj, a demakratyčnaj, i ŭ sutnaści chryścijanskaj. Heta samo saboj zrazumiełaje. Ale nia treba tak-ža i taho zabyvacca, što polskija palicyjna-administracyjnyja ŭłady kožnaha niezaležna i nacyjanalna dumajučaha biełarusa nazyvali kamunistym, i ŭreście rabili im kamunistyčnyja pracesy, pasyłali ŭ Biarezu, vysyłali z Vilni. Heta ŭžo była viedamaja polskaja metoda-nazyvać biełarusaŭ kamunistymi i niščyć ich. Heta była metoda baraćby z biełaruskim nacyjanalnym rucham. Hetkaja metoda na stolki była pašyranaj i papularnaj u Polščy, što jej karystałasia davoli šyroka i polskaje hramadzianstva. Voś-ža treba ścvierdzić, što kab zachavać adziny biełaruski nacyjanalny i niezaležny časapis u Polščy i kab praz jaho zachavać biełaruskuju nacyjanalnuju ideju, redaktar J. Paźniak moh i zhuščać antykamunistyčnyja kolery, baroniačysia hetym ad taho polskaha bizuna, jaki nad im uściaž visieŭ. U hetkaj atmasfery prychodziłasia pracavać biełaruskamu redaktaru. Atmosfera heta była jaho navat davioŭšy da krajniaj nervovaści.

Kančajučy, ahułam treba skazać, što Paźniak česna spaŭniaŭ abaviazki biełaruskaha redaktara i česna słužyŭ biełaruskaj nacyjanalnaj idei i biełaruskamu pracoŭnamu narodu. Spadziajomsia, što saviecki sud, kali budzie jaho sudzić, usio heta voźmie pad uvahu. Da ŭsiaho hetaha treba tak-ža adciemić, što J. Paźniak maje padstavy być litoŭskim hramadzianinam.

Havoračy tut ab red. J. Paźniaku, my ni kolki nia dumajem pamianšać zasłuhaŭ inšych biełarusaŭ, tak-ža vyviezienych u Sav. Biełaruś. Špisak ich my ŭ svaim časie padavali. Sprava Paźniaka my tut abhavaryli šyrej dziela taho, što ŭ našych varunkach uvažajem jaje moža najbolš typovaj, a tak-ža i tamu, što jaje najlepš znajem.

M. K.

Da nasielnictva Miesta Vilni

HRAMADZIANIE!

Chutka nastanie dzień 16 lutaha. Dzień hety prypaminaje nam toj histaryčny fakt, kali 22 hady tamu, vybranaja ŭsiej Litvoj Litoŭskaja Rada ŭ Vilni abvieściła niezaležnaść Litvy sa stalicaj Vilniaj.

Hetym aktam prad usim śvietam było vyjaŭlena žadańnie ŭsich žycharoŭ Litvy: u svabodzie žyć i ŭ svabodzie raźvivać matarjalnyja i duchovyja vartaści narodu. Sercu-ž Litvy — darahoj Vilni — viarnuć słaŭnuju jaho minuŭščynu i imia stalicy.

Vialikim jošć ščaściem śviatkavać Niezaležnaść nareščie ŭ tym mieście, u muroch katoraha paŭstaŭ heny słaŭny Akt. Dziela hetaha, dałučajučysia ŭ hetym dni da radaści dačok i synoŭ našaj ziamli, my žychary hetaha miesta, biaz roźnicy jazyka i nacyjanalnaści, składajma jamu pašanu pavažna i ŭ śviatočnym nastroi. Mnohaludna biaručy ŭčaście ŭ abchodzie i nabaženstvie, pry tym dziakujučy Tvarcu, jaki asłaniŭ kraj naš ad niaščaścia vajny, prydajma miestu śviatočny vyhlad. Arhanizacyi, ustanovy, a tak-ža pryvatnyja asoby niachaj prybiaruć svaje damy litoŭskimi narodnymi ściahami, vitryny i vokny — herbam Litvy, partretami vialikich litoŭskich kniazioŭ Hiedymina, Vitaŭta, partretami Prezydenta Dziaržavy i d-ra Basanoviča.

Niachaj hety dzień prypaminaje nam słaŭnuju minuŭščynu Litvy i Vilni, niachaj nas pabudžaje da pracy dziela hetaha miesta i śvietłaj budučyni i cełaj Litvy!

Niachaj žyvie Niezaležnaja Litva sa stalicaj Vilniaj!

Vilenski Kamitet dziela ŭšanavańnia Śviata Niezaležnaści Litvy.

Staršynia: *K. Stašys*
Burmistr miesta Vilnius

Zastupniki Staršyni: *Adv. B. Šyškoŭski*, pradstaŭnik Evanh.-Reform. Kalehii; *Dr. J. Vyhodzki*, Staršynia Žydoŭskaj Hminy ŭ Vilni

Skarbnik: *Ks. Ad. Stankievič*, Dyrektar Biel. Prohimnazii i staršynia Biel. Centru ŭ Litvie

Sakratar: *Dyr. J. Kareckas*, siabra Centralnaha Uradu Litoŭskich Achvotnikaŭ

Siabry: *Ks. K. Čybiras* — Staršynia T-va „Rytas", *Hadžy Seraja Chan Šaašal* — Karaimski Hachan, *Dr. J. Šynkievič* — Mufti Litoŭskich Musulmanaŭ, *Jury Moller* — Staršynia Rasiejskaha T-va, *Płk. Fr. Kaŭnas* — Kamandant Vilenskich Stralcoŭ, *J. Macejka* — Mahistar filozofii.

Prahrama śviatkavańnia 22-ch uhodkaŭ abvieščańnia Niezaležnaści Litvy ŭ Vilni

16 lutaha 1940 h.

1. A hadzinie 8 zavieśańnie narodnaha ściahu na hary Hiedymina. U hety samy čas usie damy tak-ža majuć być prybrany ściahami.

2. A hadz. 11 uračystaje nabaženstva ŭ katedry. U inšych śviatyniach nabaženstvy majuć adbycca svaim paradkam.

3. A hadz. 12 min. 30 parad na Placy Katedralnym. U paradzie biaruć učaście: časci vojska, dabravolcy i šaulisy.

4. A hadz. 13 min. 30 adkryćcie pamiatkavaj doški pry domie, u jakim odbyłosia abvieščańnie Niezaležnaści Litvy (Vialikaja vulica Nr. 2).

5. Adhetul delehacyi arhanizacyjaŭ adpraviacca na mohiłki Rosy kab uzłažyć, vianki na mahiły žaŭnieraŭ i d-ra Basanoviča.

6. A hadz. 14 min 30 u zali miestavaha teatru „Milda" (byŭš. „Marsa") (Vostrabramskaja vul. Nr. 5) adčyt praf. Romera dla vilenskaha hramadzianstva (palitoŭsku i papolsku). Paśla kancert.

7. A hadz. 16 abrad spuščeńnia ściahu na hary Hiedymina. (Z damoŭ treba pazdymać ściahi a hadz. 20).

8. A hadz. 17 u miestavym teatry (vul. Basanoviča, b. V. Pahulanka) ŭračystaje pasiedžańnie i kancert. Uvachod pa zaprosinach. Arhanizacyi prysyłajuć ściahi.

9. Samyja arhanizacyi ŭ adpaviednym časie adbuduć svaje ŭračystyja pasiedžańni ŭ asobnych zalach.

UVAHA: Ad 13 h. 30 min. uva ŭsich kino-teatrach miesta Vilni buduć dany dva seansy darma dla niezamožnych hramadzian. Chto zachoča skarystać z hetaj nahody, moža atrymać bilety ŭ Mahistracie ŭ addziełach sacyjalnaj apieki abo ŭ addziele aśviety. Rabotniki mohuć atrymać bilety praz administracyju punktaŭ svajej pracy.

Biełarusy ŭšanujuć 22-ja uhodki niezaležnaści Litvy ŭ nastupnym paradku:

9 hadz. 30 min. nabaženstva ŭ kaściele śv. Mikałaja.

10 hadz. — Akademija ŭ zali Biełaruskaj Himnazii (Daminikanskaja vul. 3-5 — u panadvorku).

Ня можам прызнаць!

Вялікае няшчасьце, калі духоўнік і пасомыя — чужыя адзін другому! А яшчэ горш, калі духавенства пачынае накідваць вернікам чужую ім ідэолёгію, як гэта бывала за часоў расейскага, а пасьля і польскага ў нас панаваньня. Тады вернікі пачынаюць чурацца сваіх духоўнікаў, бо бачаць у іх асобах ня прыяцеляў і духоўных настаўнікаў, а сваіх ворагаў. Такія суадносіны паміж пасомымі і пастырам дрэнна адбіваюцца на Царкве і некарысна гэта для супакою грамадзкага ў краю наагул.

У нас Царква спрадвеку была Царквой нацыянальнай-беларускай. Барацьба за гэту нацыянальную апрычонасьць нашае Царквы гэта адзін з найгалаўнейшых матываў нашае гісторыі ў пару палітычнага заняпаду Беларусі. У працягу 150 гадоў Царква праз насланае чужацкае духавенства служыла ў нас русыф'кацыі беларускага насельніцтва. Гэта самае чужацкае духавенства ў часы польскага панаваньня ня горш спаўняла сваю роль і далей, а да гэтага йшчэ і полёнізавала.

А сягоньня... Новыя „уладары"' Царквы зьяўляюцца чужымі для нас ня толькі па свайму паходжаньню, але і па сваей ідэолёгіі. Яны вераць, што край наш — «искони русскія земли», а сучасны гістарычны мамэнт — гэта пераходная фаза да «адзінай і недзялімай» пад «скипетром бѣлаго царя». Адкрыта праводзіць свае тэзы ў жыцьцё — яны аднак ня могуць і дзеля таго праз Царкву ўпаіваюць у масы пагляды:

1) што Царква не павінна траціць сувязі із сваім каранём — Маскоўскаю Маці-Царквою, а тых, хто гэнай сувязі не прызнае, аб'яўляюць „неблагадатнымі і адшчапенцамі".

2) Падбіраюць духавенства, якое ў сваей палітычнай ідэолёгіі не разыходзіцца з сваім кіраўніцтвам.

3) Саборнасьць Царквы выкарыстоўваецца дзеля фікцыйных выбараў, з якіх выходзяць самыя толькі расейцы.

4) Пачынаецца перасьледаваньне не расейскага духавенства — і ўсё гэта робіцца пад эгідай „каканічнасьці".

Гэткіх паступкаў надужываньня царкоўнай улады нашымі сяньняшнімі царкоўнымі „уладарамі" — і іх самых — беларускае праваслаўнае грамадзянства ані прызнаваць, ані пакрываць ня можа. Беларусы хочуць мець Царкву, якая была-б ім роднай і блізкай, якая аб'яднала-б каля сябе наш праваслаўны народ і была-б пацяшыцельніцай у сяньняшніх цяжкіх варунках жыцьця, а ня служыла-б мэтам чужацкай палітыкі.

Стары Барацьбіт.

П.О.В. учора і сягоньня

П О.В. — гэта першыя літары поўнага назову: „Польская Організацыя Вайсковая". Паўстала яна даўно і сябе выявіла асабліва ў часы 2-е расейскае рэвалюцыі 1917 году ды ў часе кастрычнікаўскага перавароту і вынікнуўшых з яго падзеяў.

У сябры П.О В. увaxодзілі ўсе польскія абшарнікі на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны, а таксама іхнія сыны, што займалі ахвіцэрскія пасады ў розных частках расейскае арміі ды пасады чыноўнікаў, інжынераў і дахтароў у расейскіх інтэнданцкіх складах, у артылерыйскіх парках ды лазарэтах. Гуртуючыся каля легальнага Польскага Вярхоўнага Камітэту ў Менску і каля Таварыства Пацярпеўшых ад вайны і спрытна хаваючыся за шыльдамі розных дабрачынных установаў, сябры П.О.В. стараліся пралезьці ў розныя тылавыя ўстановы і нават у штаб Заходняга Фронту, які таксама знаходзіўся ў Менску. Дзякуючы старым сувязям польскага абшарніцтва з абшарніцтвам расейскім і з рознымі расейскімі ўплывовымі кругамі, польскім ахвіцэрам і чынавецтву даволі лёгка ўдалося захапіць у свае рукі кіраўніцтва ў цэлым шэрагу адказных штабных цэнтраў і на складах амуніцыі, раскіданых па ўсей тэрыторыі былага расейска-нямецкага фронту ў Беларусі.

З дапамогаю сваіх людзей у штабах і на складах, а таксама выкарыстваючы старыя сувязі, П.О В. канчаткова захапіла ў свае рукі тэрыторыю ў трыкутніку паміж беларускімі гарадамі: Стары Быхаў, Рагачоў і крэпасьць-склад Бабруйск. У гэты трыкутнік, з ведама Керэнскага, які ўлетку 1917 году быў вайсковым міністрам Расеі, і за згодай расейскага генэралітэту, паляні пачалі сьцягіваць з усіх куткоў Расеі свае вайсковыя часткі, якія і аб'ядналіся тутака ў асобны польскі корпус пад камандай генэрала Доўбар-Мусьніцкага.

Беларускія арганізацыі ў Менску моцна пратэставалі супроць зьмяшчэньня на тэрыторыі Беларусі польскіх ваенных фармацыяў, бо добра разумелі тую небясьпеку, якую выяўляла для беларускага народу і ягоных новапаўстаўшых цэнтральных установаў польская збройная сіла, кіраваная абшарнікамі. Аднак, пратэсты беларусаў ня былі прыняты пад увагу ні Керэнскім, ні захапіўшым ад яго ўладу ў расейскай арміі бальшавіцкім глаўкаверхам Крыленкам: польскія войскі ўсю зіму 1917—18 году плылі на Беларусь і пачалі ўжо нават рыхтавацца да захопу самага Менску.

Пляны, якія паставілі сабе сябры П.О.В., былі дужа шырокія: выкарыстаць часовае зьнясіленьне Расеі і адрадзіць Польшч у межах 1772 году, гэта ёсьць ня толькі аднавіць самую Польшч у яе этнографічных межах, але і падбіць пад уладу Польшчы ўсю Беларусь, усю Літву і большую частку Латвіі ды Украіны.

Агульная палітычная сытуацыя палякам складалася вельмі карысна. Расея, зьнясіленая вайной і ўнутранымі рэвалюцыйнымі бойкамі, нічога ня мела супроць адраджэньня Польшчы і, нават, дапамагала Доўбар-Мусьніцкаму фармаваць польскае войска на тэрыторыі Беларусі. Нямеччына таксама падтрымоўвала польскія імкненьні і дапамагала Пілсудзкаму арганізаваць польскія легіёны ў Варшаве. Францыя сфармавала і ўтрымоўвала на сваей тэрыторыі польскі легіён генэрала Гальлера, які мог быць добрай рэзэрвай для першых двух фармацыяў. Урэшце — ўсе гэтыя фармацыі і аграмадныя запасы зброі ня толькі не каштавалі польскім арганізацыям ніводнага гроша, але яшчэ давалі моцныя грашовыя сродкі для вядзеньня шырокай прапагандной акцыі за межамі. Гэткія на-дзіва шчасьлівыя абставіны могуць стварыцца для народу толькі раз у стагодзьдзе!

Аднак, на перашкодзе да зьдзейсьненьня вялікадзяржаўных пляноў П.О.В. сталі адраджэнскія імкненьні і нацыянальныя арганізацыі беларусаў, украінцаў, ліцьвіноў і латышоў. Гэтыя народы ня мелі ні падтрымкі вялікіх дзяржаў, ні ўласных сродкаў, але ў іх была вялікая моральная сіла і моцная воля да ўласнага дзяржаўнага жыцьця.

Асабліва нечаканымі, а тому і надзвычайна ненавіснымі для П.О.В.

З газэт

„І ўсё і нічога“

У віленскім „Nowym Słowie“ № 26, у артыкуле „Z życia prawosławnych białorusinów“ знаходзім цікавы адгалосак у справе наказу архіеп. Элеўферага ў справе ўжываньня беларускага языка ў царкве і ў школах, аб чым у сваім часе (глядзі „Крыніца“ № 8) была зацемка і ў нас. Аўтор названага артыкулу піша ў гэтай справе між інш. так:

„У наказе (ў арыгінале: „oświadczenie“) гэтым праўду кажучы сказана ўсё і нічога. Задачай духоўных уладаў ня ёсьць-жа толькі ласкава згаджацца на тое, што пасьвячана Эванэліяй, навукай Цэрквы і ўсей хрысьціянскай традыцыяй, але задачай іхняй ёсьць аблегчыць усё гэта верным уво дзіць у жыцьцё дзеля дабра душ, дзеля Божай хвалы. Гэтак уласьціва павінна было-б быць і з казаньнямі для праваслаўных беларусаў. Тут духоўныя праваслаўныя ўлады павінны не згаджацца на тое, што фактычна ад іхняй ласкі не залежа, але павінны празначыць беларусам асобную праваслаўную царкву і асобнага духоўніка беларуса“.

HRAMADZIANIE! Prysyłajcie adrasy svaich znajomych, kab i jany mahli atrymać probny numar „Krynicy“.

100-ja ŭhodki skasavańnia Litoŭskaha Statutu

Jak viedama, Litoŭski Statut heta jość kodeks zakonadaŭstva Vialikaha Kniastva Litoŭskaha. Vychodziŭ jon u troch vydańniach, u 1529, u 1566 i ŭ 1588 hodzie i taksama papularna nazyvajecca: pieršy Statut, druhi Statut i treci Statut. Pieršy i druhi Statut u svaim časie drukavanyja nia byli, drukavaŭsia-ž tolki Statut treci. Važna viedać, što hety vielmi cenny dakument pisaŭsia i drukavaŭsia p a b i e ł a r u s k u. Rabiŭ heta Vialiki Kancler V. Kniastva Litoŭskaha, biełarus kniaź Leŭ Sapieha.

Pieršaje-ž polskaje vydańnie hetaha Statutu adnosicca až da 1614 hodu.

Litoŭskim statutam u Vialikim Kniastvie Litoŭskim kiravałasia ŭsio prava jak palityčnaje, tak sudova-cyvilnaje i karnaje. Pravamocnaść hetaha Statutu zachavałasia, z peŭnymi źmienami, i pa padziele Rečypaspalitaj. Nie čapała jaho caryca Kaciaryna, nie čapali jaho cary Pavał i Aleksandar I. I tolki car Mikałaj I ukazam z 1 studnia 1831 h. skasavaŭ moc Litoŭskaha Statutu na abšary Viciebskaj i Mahileŭskaj huberniaŭ, dałučanych da Rasiei pa pieršym padziele RčP., h. zn. u 1772 h. Daśledčyki hetaj pary kažuć, što skasavańnie Lit. Statutu nia było ŭ nijakaj suviazi z represijami za polskaje paŭstańnie 1831 h., a pro.ta było vyražeńniem centralistyčnych imkneńniaŭ takich pradstaŭnikoŭ tahačasnaj rasiejskaj administracyi, jak kniaź Chavanski, jak hubernatar Mahileŭski M. Muraŭjoŭ (paźniej nazvany „viešacielam“) i inš.

Praz niapoŭnych 10 hadoŭ paśla pieršaha zahadu ab skasavańni Statutu, nastaŭ druhi i apošni zahad. Stałasia heta hałoŭnym čynam na damahańnie kijeŭskich hubernataraŭ Żełtuchina i Bibikova, pry ŭčaści dyrektara departamentu čužych vieravyznańniaŭ F. Vigiela. Užo 2 maja 1840 h. car Mikałaj I daŭ svaju zhodu na skasavańnie Statutu, a 25 červienia padpisaŭ imienny ukaz, jakim skasavaŭ moc Statutu ŭ huberniach: Kijeŭskaj, Padolskaj, Vałynskaj, *Mienskai, Vilenskaj i Horadzienskaj*. Ukaz hety apublikavany byŭ 21 vieraśnia 1840 h., a Vilenski «Литовскій Вѣстникъ» abvieściŭ jaho 27-ha vieraśnia 1840 h.

Hetak prad 100 hadami, pa 311 hadoch žyćcia, pierastaŭ dzieić Litoŭski Statut, jaki dla nas biełarusaŭ źjaŭlajecca cennym nia tolki jak zbor zakonaŭ, ale i jak śviedka našaj vysokaj u toj čas kultury.

Z. M.

Pišučy adrasy, padavajcie asabliva vyrazna nazovy pošty, vioski i samo proźvišča!

Finy nia chočuć palakoŭ

Jak užo viedama, Francyja i Anhlija chočuć byccam vysłać u Finlandyju b. polskich žaŭnieraŭ, uciokšych tudy prad prajhranaj vajnoj z Niamieččynaj. „Nowe Słowo“ piša ab hetym vojsku tak:

„Finy zusim nie spadziajucca dziejnaj pomačy z boku ŭciekačoŭ b. polskaj armii sabranych ciapier u Francyi.

Finski ŭrad robić staráńni, kab sajuźniki (Francyja i Anhlija — *red.*) nia prysyłali ŭ Finlandyju emihrantaŭ polskich. Pa dumcy Finaŭ uciekačy hetyja, jak vajskovyja, nie pradstaŭlajuć nijakaj vartaści“.

Zakončana śledztva tajnaj polskaj arhanizacyi

Śledztva ŭ spravie vykrytaj tajnaj polskaj arhanizacyi ŭ Vilni užo zakončana. 5 vinavatych asob vysłany ŭžo ŭ abozy pracy, pajmienna: b. vice-starasta vilenski Zabielski („włóczęga“), Żyźnieŭski, Smulovič, Trukanovič i Smastin. — Sprava dalšych 13-cioch pierasłana kamandzieru Vilenskaj hrupy vojsk. Śiarod hetych apošnich znachodziacca: V. Patrycy (b. hałoŭny redaktar „Pat'a“, 2 asystenty universytetu, 1 inžynier radiostancyi, 5 studentaŭ i 4 kabiety, jakija prad vajnoj pracavali ŭ vajavodztvie.

акazaліся нацыянальныя арганізацыі беларускія: Вялікая Беларуская Рада і Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада, якія знаходзіліся ў Менску і фармавалі тамака, і ў іншых мясцох, беларускае войска. Беларускія вайсковыя часткі ў Менску і Воршы пагражалі праваму флангу корпуса Доўбар-Мусьніцкага, апроч таго і ў самым трыкутніку, занятым польскім корпусам, Беларуская Рада мела сваіх прадстаўнікоў і мясцовыя беларускія арганізацыі, якія з усіх сіл працівіліся спробам палякоў арганізаваць тутака сваю польскую адміністрацыю, а таксама і спробам польскіх абшарнікаў караць беларускіх сялян за захоп абшарніцкае зямлі і лясоў.

Ня маючы зручнасьці разграміць Беларускую Раду сілаю, прыцаўнікі П.О.В. пайшлі на хітрыкі. Яны падсылалі сваіх агентаў да беларусаў, каб выведаць беларускія пляны, распушчалі розныя плёткі, каб скампраматаваць беларускі рух і яго ных кіраўнікоў, выдумоўвалі і пашыралі панічныя чуткі, каб напалохаць паасобных працаўнікоў і зьбіць з панталыку беларускае мяшчанства і сялянства, нарэшце пачалі пісаць даносы на беларусаў у прэсу і ў розныя штабы. Урэшце, скарыстаўшы момэнт, калі расейскія ахвіцэры, пасьля кастрычнікаўскага перавароту, пачалі ўцякаць на Дон, — П.О.В. накіравала цэлую групу польскіх ахвіцэраў, прыкінуўшыхся рэвалюцыйнымі прыхільнікамі бальшавікоў, на пакінутыя расейцамі пасады ў штаб Заходняга Фронту, каб з дапамогаю яго затрымаць справу беларускіх вайсковых фармаваньняў. Знайшліся і такія спрытныя сябры П.О.В., што прапезлі нават у „Чэ-Ка“ і адтуль рабілі напады на Цэнтральную Вайсковую Раду і Усебеларускі Кангрэс.

У значнай меры інтрыгамі сяброў П.О.В., сядзеўшымі ў Менскай „Чэ Ка“, былі правалены і тыя дужа важныя перагаворы, якія, па прыкладу Фінляндыі, Беларуская Рада навязала з Саветам Камісараў у Пецярбурзе, каторы б ы ў с к л о н н ы п р ы з н а ц ь незалежнасьць Беларусі на тых-жа ўмовах, як была прызнана незалежнасьць Фінляндыі і Польшчы. Перагаворы гэтыя былі сарваны дзякуючы пратэстам Менскіх бальшавіцкіх арганізацый.

Выступленьні П.О.В супроць беларусаў паўтараліся і потым не адзін яшчэ раз: і ў М е н с к у, дзе — на аснове польскіх даносаў і падасланых з 2-га аддзелу правакатараў — ствараўся працэс за працэсам з мэтаю разваліць вырастаючы там цэнтр беларускае культуры, і ў В і ц е б с к у, дзе польскі „рэвалюцыйны“ батальён разстраляў беларускую роту і беларускіх дзеячоў, і ў Г о р а д н і, дзе польскія войскі абязброілі беларускі полк і камэндантуру, і нават на тэрыторыі Л а т в і і, дзе ў 1921 г. сябры П.О.В. (аб чым чытаемо ў справаздачы Т-ва „Бацькаўшчына“) тэрарызавалі рознымі чуткамі і пагрозамі ня толькі беларусаў, але і латышоў, пашыраючы весткі аб тым, што „на наступным тыдню Дзьвінск абавязкава будзе захоплены палякамі“. У Дзьвінску справа даходзіла да таго, што некаторыя чыноўнікі заўсёды трымалі чамаданы запакаванымі „на ўсякі выпадак“ і на станцыі стаяў бранявы цягнік.

Аднак, захапіць Дзьвінск сябром П.О.В. не ўдалося.

Адгалоскі ўсіх гэтых як-жа нядаўных падзеяў адбіваюцца аб вушы і сягоньня. На часе дзеля таго будзе ўспомніць, што:

1) Часы зьмяніліся на некарысьць палякоў і ў найлепшым выпадку ўдасца ім адчавіць Польшч у граніцах этнографічных.

2) Народы ўсяго сьвету ўжо добра ведаюць аб існаваньні Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны і аб тым, што польскія паны, называючы гэтыя краіны сваімі п о л ь с к і м і землямі, проста абманывалі ўвесь сьвет. Дык цяпер беларускіх, літоўскіх і украінскіх зямель на зьдзек польскаму панству і чынавенцву ніхто не аддасьць.

Гісторык

Biełaruskaja chronika

Słuchajcie biełaruskija radyjovyja pieradačy: 1) 14-ha lutaha, a hadz. 19 m. 15 *vykonyvaje pierad mikrafonam vilenskaha radyjofonu biel. narodnyja pieśni viedamy śpiavak —bas Siarhiej Benoni* Ustupnaje słova i pajaśnieńni tekstu pieśniaŭ daje mhr. J. Šutovič; 2) 15 ha lutaha adbudziecca ŭ hetym-ža radyjofonie dakład mhr. J. Šutoviča na temu „*Učaście Biełarusaŭ u Baraćbie za niezaležnaść Litvy.*" Pačatak dakładu kala hadz 20 m. 45

Pasiedžańnie Uradu «Biel. Centru» adbyłosia dnia 11 lutaha. Abhavaryvalisia spravy arhanizacyjnyja, jak zapis i pryjmo novych siabroŭ, viadzień nie kancelaryi, dziełavodztva, dyžuraŭ, a tak-ža spravy dziejnaści ŭ asobnych halinach: relihijnaj, školnaj, ahulnaj kulturna-nacyjanalnaj, sprava pamočy pałonnym i inš. Kiravać dziejnaściu kulturna nacyjanalnaj budzie siabra Uradu Centru mhr. J. Šutovič.

Kiraŭnictva kulturna-nacyjanalnaj dziejnaści Biel. Centru prystupaje da arhanizacyi papularnych lekcyjaŭ. Lekcyi majuć adbyvacca ŭ kožnuju niadzielu a hadz. 5 p. p. u zali Biełaruskaj Prohimnazii — Dominikanskaja 3-5. Uchod na hetyja „niadzielniki" biasplatny. Da hetaha času dali zhodu čytać lekcyi: staršynia Centru ks. Ad. Stankievič, inž A. Klimovič, dr. J. Stankievič, śviašč. A. Koŭš, dr. J. Malecki, dyryhient Biel. Narodnaha choru hr. Piotra Rodzievič, Uładysłaŭ Kazłoŭščyk, redaktar Jazep Najdziuk, stud. Časłaŭ Najdziuk, stud. A. Čviačkoŭski. Dalejšy zapis lektaroŭ, ahavorka pytańnia temy i vyznačeńnie niadzieli — pravodzić mhr. J. Šutovič u Redakcyi „Krynicy" ad h. 10 —11 (štodzień). Tut padajecca da viedama, što na niadzielnikach možna čytać lekcyi na ŭsiakija temy z biełarusaznaŭstva, z haliny kultury, navuki, ekanomiki i hramadzkaha žyćcia litoŭskaha i inšych narodaŭ.

Chor Biełaruskaha Centru ŭ Litvie. Užo raspačałasia narmalnaja praca Biełaruskaha Choru. Śpieŭki adbyvajucca ŭ kožnuju sieradu i piatnicu ad hadziny 19 u pamieškańni biełaruskaj Prohimnazii pry vul. Dominikanskaj 3|5 (u panadvorku). Choram kiruje fachovy dyryhient Piotra Rodzievič. — Kiraŭnictva choru prosić usich zacikaŭlenych zapisyvacca ŭ chor padčas zborak choru.

Pyraŭnańnie historyi Kryvii (Biełarus) da historyi Ukrainy. — Na hetuju temu dr. J. Stankievič pračytaje 18 ha lutaha referat ŭ Histaryčnaj Sekcyi Biełaruskaha Navukovaha T-va (Astrabramskaja 9, Biełaruski Muzej Ivana Łuckieviča). Pačatak u 11 hadz. Uchod volny siabram i haściom.

Małačarstva ŭ Vilenščynie

Ad času pryłučeńnia Vilenščyny da Litvy pačała i tut pracavać centrala małačarstva ahulnalitoŭskaha — *Pienocentras* (Małačarski Centr). Jość heta arhanizacyja kooperatyŭnaja.

Pieršaj čynnaściu Pienocentras'a pa pryłučeńni Vilenščyny było zaaprovijantavańnie hałodnaj Vilni ŭ małačarskija pradukty. Dziela hetaj mety adčynieny tut byli: adna hurtoŭnia i čatyry kramy. Ab tahočasnym ruchu handlovym Pienocentrasa śviedča choć-by fakt, što za čas ad 1 listapada 1939 h. da 1.I.1940 h., pamima niabyvała nizkich na toj čas cenaŭ, abarot siahnuŭ blizu až da miljona litaŭ. Ruch hety u Pienocentrasie nie źmianšajecca i ciapier Hurtoŭnia Pienocentrasa pradaje svaje pradukty i praz kramy pryvatnyja, a kramy ŭłasnyja majuć za zadańnie kantralavać ceny detalu i niedapuskać da ichniaha biezpadstaŭnaha padyjmańnia.

Tavar da prodažy pryvozić Pienocentras z svaich dahetulašnich małačarniaŭ, bo ŭ Vilenščynie z 14 małačarniaŭ pradvajennych pracujuć tolki čatyry. Pradvajenny Vilenski addzieł polskaha „Małačarskaha Sajuzu" ciapier likvidujecca, a jahonuju majemasć adkupiŭ „Pienocentras" Pačynajučyja ciapier pracavać małačarni Vilenščyny (pradbačycca ich tolki 6) buduć atrymoŭvać ad Pienocentrasa pazyki na koncentravanuju pašu dla karoŭ.

Dziela dalšaha razbudoŭvańnia małačarstva ŭ Vilenščynie patrebny hrošy. Ciapier iduć staraňni, kab škiravać dla Vilenskaha Małačarstva tyja nadvyžki achviar, jakija litoŭskaje małačarstva ŭ svaim časie dało Kamitetu Pamačy Vilenščynie (zamiest zadeklaravanych 100.000 litaŭ dało až 170 000 l.).

Tak ci hetak, šmat pryjdziecca jšče ŭłažyć pracy i hrošaŭ, kab małačarstva Vilenščyny zraŭniać z małačarstvam rešty Litvy i kab heta małačarstva mahło pracavać dalej užo svaimi siłami. **Z. J.**

Dr. med. **B. Tołčynski**
b. Asystent Kliniki U.S.B.
Chvaroby vušej, nasa i horła.
Zavalnaja 10, tel. 16-38.
Pryjmaje: 8-10 i 16-19 hadz.

BIURO Pigus Patarnavimas
Vilnius, vul. šv. Filipa 1 kv. 20 (kala kašc. šv. Jakuba) telef. 16-68).
Piša prośby u spravach sudovych, administracyjnych i inšych, tłumača na litoŭskuju movu dakumenty.

Dr. med. **M. Feigenberg**
b. Asystent Universyteckaj Kliniki
Urolog-chirurg
Spec. chvaroby nyrak, mačavoha puzyra i płoclavych orhanaŭ.
Vilnia, Vilenskaja 25 6, tel. 27-90.
Pryjmaje ŭ 12—2 i 15—18 hadz.

VOKAM PA ŚVIECIE

U Finlandyi bai uzmahajucca. Ab značeńni pałažeńnia na henym froncie śviedča choć-by toje, što kamandavańnie saveckimi vajennymi operacyjami ŭziaŭ sam vajenny kamisar SSSR K. Varašyłaŭ. Pašyranaja ŭ min. tydni čutka ab tym, što saveckaje vojska prałamała finskuju abaronnuju liniju Mannerheima, nie paćvierdziłasia. Vajennaja narada anhlicka-francuskaja byccam pastanavila vysłać finam pomač nia tolki ŭ formie vajennaha materjału, ale i ludźmi. Uporna havorać, što ŭ Finlandyju pajeduć palaki, jakija znajšlisia ciapier u Francyi i ŭ Anhlii. Nia viedama adnak, kudoj hetu pomač pieravieźci, bo Niamieččyna byccam zajaviła, što kali Švecyja ci Narvehija prapuścić takija transparty, dyk jana ŭvažała-b heta za narušeńnie henymi dziaržavami neŭtralnaści i adpaviedna da hetaha pastupiła-b.

Na zachodnim froncie tolki artyleryjskaja pierastrełka i raźviedki.

U Švecyi. U subotu rana palicyja zrabiła reviziju ŭ arhanizacyjnych pamieškańniach Švedzkaj kamunistyčnaj partyi ŭ Štokholmie. Mnoha asob aryštavana, u tym liku i čužyncaŭ. Pry revizii zabrany važnyja dakumenty.

Na Blizki Ŭschod što raz bolš zvaračvajuć ludzi ŭvahu i stul nie adzin spadziajecca niejkich pieramien. Pisałasia užo ab tym, što tam byccam arhanizujecca vialikaja armija, jakaja maje zahrazić Savietam ad paŭdnia, zabirajučy užo nia tolki naŭkaz (karasina ŭ Baku), ale ukrainu (chleb). Byŭ-by heta, pa dumcy arhanizataraŭ hetaha planu, udar nia tolki pa Savietach, ale i pa Niamieččynie. Ci heta armija užo sarhanizavana, — ab hetym nie havorycca. Viedama tolki, što francuski hieneral Weygand, jaki hetu armiju maje arhanizavać, užo doŭhi čas abjaždžaje ŭsie staronki Blizkaha uschodu, a anahdaj tudy pajechaŭ i haloŭny kamandzier francuskaj armii hien. Gamelain — Chiba-ž heta tyja pajezdki niešta značać.

Ameryka cikavicca Eŭropaj. Prezydent Złuč. Štataŭ Paŭn. Ameryki Roosevelt vysyłaje svajho vice-ministra zahraničnych spraŭ Sunner Welles u Eŭropu, dakładna—ŭ Italiju, Francyju, Niamieččynu i Anhliju, kab „sabrać bolš dadzienych ab ahulnaj sučasnaj sytuacyi ŭ Eŭropie. Welles byccam z uradami nazvanych krainaŭ nia budzie viešci pierahavoraŭ, ani pasiaredničać. Pastanova ab vysyłcy hetaha paŭnamocnika stałasia byccam zusim niečakana i tamu joj ciapier usie vielmi zacikavilisia.—Što Ameryka ciapier pačynaje specyjalna cikavicca padziejami ŭ Eŭropie, pakazvaje i toje, što ambasadar amerykanski ŭ Paryžy Bullit jeździŭ na aeraplanie z dakładam da prezydenta Roosevelta.

Ameryka arhanizuje mir? Na inšym miescy siańnia pišam ab tym, što ŭ Eŭropu vyjechaŭ pradstaŭnik prezydenta Roosevelta, kab adviedać dziaržavy vajujučyja. Ciapier-ža Ministerstva zahraničnych spraŭ Złuč. Štataŭ vydała aficyjalny kamunikat ab tym, što ŭžo pačało aficyjalnyja dyplomatyčnyja hutarki z niekatorymi dziaržavami neŭtralnymi.

Žyćcio ŭ Vilni i Kraju

Aŭtostradu, h. zn. šyrokuju (18 mtr.) šasu miž Vilniaj i Kaŭnasam dumajuć pabudavać litoŭskija inžyniery. Daŭžynia hetaj šasy była-b kala 100 klm. (ad Ratuša ŭ Kaŭnasie da Katedry ŭ Vilni). Kaštavała-b heta šasa 15 mln. lit. Možna było-b na jej jechać sa skoraściu 120 klm u hadzinu.

Kasujuć turmy. Dahetulašnija ŭłady pakinuli Vilni šmat i vialikich turmaŭ. Litoŭskija ŭłady, jak paviedamlajuć hazety, pastanavili bolšaść hetych turmaŭ skasavać i pakinuć tolki adnu — Łukiskuju.

Hrošy buduć prynosić da chaty. Jak viedama, dahetul u Vilni pa hrošy pierasyłanyja paštovym pieravodam adresat musiŭ chadzić na poštu. Ad 9 h. m. paštaljony buduć prynosić takija hrošy prosta da chaty adresata.

Eksportny skład jajok u Vilni maje być sarhanizavany sioleta viasnoj pry vakzale. Skład hety absłuhoŭvaŭ-by paviety: vilenski, trocki, śviancianskaŭski, aziarosaŭski, ucianski, vilkamierski i alitaŭski.

Na hadzinu napierad pierasuniem čas. U hetaj spravie z adpaviednaj prapazykaj da Uradu vystupiŭ ministr finansaŭ. Prapazyka umotyvavana tym, kab pa prykładu Łatvii zaaščadzić na darahim apale. Źmiena heta uvajšła-b u žyćcio z dniom 1 sakavika 1940 h.

Aščadžajuć apał. Z uvahi na aščadnaść apału ad 7 lutaha da 1 sakavika adklikany 21 ciahnik, u hetym liku 6 ciahnikoŭ u Vilenščynie. — Rachujuć tak ža, što pryjdziecca aščadžać papieru na hazety, bo papiernia maje vuhla tolki na miesiac.

Paradak meldunkaŭ ad 1 sakavika źmianiajecca. Da hetaha dnia usie ułaśniki damoŭ, hotelaŭ, zajezdnych i načležnych damoŭ pavinny kupić novyja damovyja knihi i ŭ ich upisać usie biaz vyniatkaŭ asoby, jakija faktyčna žyvuć u hetych damoch.

Vilenski Universytet pašyrajecca. Rektar Vilenskaha universytetu praf. Dr. M Biržyška, u hutarcy z pradstaŭnikami hazet zajaviŭ, što ŭvosieni 1940 h. u Vilniu pieranosicca z Kaŭnasa fizyka-matematyčny fakultet. Akramia taho ŭ adpaviednych kruhach razvažajecca dumka ab sarhanizavańni jšče i fakultetu (abo asobnaj Akademii) Mastactva.

Admoviŭsia być ministram? Viedamy i na Vilenskim hruncie polski monarchistyčny palityk Uładysłaŭ Studnicki, jaki z moładu jšče nia skryvaŭ svaich sympatyjaŭ da Niamieččyny, ciapier byccam znachodzicca na abšary Polščy zaniatym Niamieččynaj. Polskija hazety pišuć, što niemcy sulili Ul. Studnickamu być ministram, ale jon ad hetaha admoviŭsia.

Zoolohičny park Varšaŭski, ci lepš skazać čaść hetaha parku ucaleŭšaja ad bombardavańnia Varšavy, viasnoj maje być pieraviezieny ŭ Königsberg.

Vajna na filmie. U Berlinie pakazvajuć užo film „Vajna ŭ Polščy". Zdymki zrobleny z pieršych frantovych linijaŭ, z samalotaŭ i z karabloŭ. Pakazana ŭ im i vialikaja defilada niamieckaha vojska ŭ zdabytaj Varšavie

Leidėjas ir Redaktorius: ADOLFAS KLIMAVIČIUS Telefon u drukarniu i redakcyju 23-32. Fr. Skarynos vardo Gudų Spaustuvė, Vilnius, Pylimo g-vė 1
Vydaviec i Redaktar: ADOLF KLIMOVIČ Biel. Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, vul. Zavalnaja 1.

VILNIUS Biblioteka